# Блаславёныя Скарынай

## 500-годдзю беларускага кнігадрукавання прысвечана шмат цікавых праектаў

**У наступным годзе мы будзем адзначаць 500-годдзе вялікай падзеі ў нашай гісторыі, калі ўраджэнец Полацка Францыск Скарына надрукаваў першы экзэмпляр Псалтыра ў беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы і тым самым паклаў пачатак айчыннаму кнігадрукаванню, зрабіў чытанне больш даступным і танным. Дата больш чым значная. Таму і рыхтавацца да яе пачалі загадзя. Мы раскажам вам пра самыя выбітныя скарынаўскія праекты, якія ўжо ажыццяўляюцца.**



## Вяртанне праз стагоддзі

Хіба не самы маштабны праект — выпуск факсімільнага выдання “Кніжная спадчына Францыска Скарыны”, які быў пачаты Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры падтрымцы Банка БелВЭБ яшчэ ў 2013 годзе. Яго плануюць завяршыць у юбілейны 2017 год. Праект прадугледжвае перавыданне 25 кніг, якія надрукаваў Францыск Скарына ў Празе (1517—1519) і Вільна (1522—1525). У аснове факсімільнага выдання — электронныя копіі кніг першадрукара, якія знаходзяцца ў бібліятэках і музеях Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і іншых краін. Пры гэтым максімальна захоўваюцца структура, змест, асаблівасці шрыфтоў і гравюр арыгінальных выданняў.

З прыблізна 500 вядомых асобнікаў кніг Скарыны толькі 10 знаходзіцца ў Беларусі. Таму факсімільнае выданне скарынаўскіх работ дазволіць пазнаёміцца з імі шырокаму колу грамадскасці, не трацячыся на квіткі, не пераадольваючы сотні кіламетраў і не просячы аб доступе ў замежныя бібліятэкі і архівы.

# У чаканні будучых прэм’ер

Магчыма, па інфармацыю пра Скарыну мы хутка будзем хадзіць не толькі ў бібліятэкі і музеі, але і ў тэатры. Завяршыўся конкурс твораў для драматычнага тэатра “Францыск Скарына і сучаснасць”, ініцыяваны Рэспубліканскім тэатрам беларускай драматургіі і Нацыянальнай бібліятэкай пры падтрымцы Беларусбанка. Конкурс праводзіўся ў пяці намінацыях: гістарычная п’еса, сучасная п’еса, п’еса па матывах, інсцэніроўка і сцэнічная ідэя. У кожнай намінацыі плануецца аб’явіць уладальніка асноўнай і дзвюх заахвочвальных прэмій.

Пасля аб’яўлення пераможцаў конкурсныя п’есы збіраюцца апублікаваць у зборніку. Адна з п’ес дакладна ўбачыць свет на сцэне РТБД, іншыя, магчыма, будуць пастаўлены на сцэнах іншых тэатраў. У планах таксама паказ п’ес-пераможцаў за мяжой — Скарына заслугоўвае, каб пра яго больш ведалі ў свеце.

# Выдавецкая галерэя

Яшчэ адна арыгінальная ініцыятыва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — выдавецкі праект “Мастацкая Скарыніяна”. Вядома, постаць Скарыны здаўна прыцягвала ўвагу творцаў розных жанраў. І за апошнія сто гадоў створана столькі значных аб’ектаў мастацтва, што толькі па іх можна меркаваць пра Скарыну як пра аднаго з найбольш выбітных дзеячаў айчыннай культуры. На дадзены момант яны захоўваюцца не толькі ў розных кутках нашай краіны, але і за мяжой.

Дзякуючы праекту Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі “Мастацкая Скарыніяна” ўсе творы жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і іншых форм творчасці, прысвечаныя асобе і спадчыне беларускага першадрукара, цяпер можна пабачыць у вельмі даступнай форме. Каштоўнасць выдання павялічваецца таксама за кошт таго, что многія з прадстаўленых у выдавецкай серыі твораў мастацтва раней не былі вядомыя шырокай аўдыторыі.

# Машына часу

Падрыхтоўка да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання не магла абысціся без уключэння ў справу дзяцей — калі, як не з маленства, прывучаць да чытання? “У гасцях у Францыска Скарыны” — так называецца новая дзіцячая кніга Выдавецкага дома “Звязда”, выпушчаная спецыяльна да Дня беларускага пісьменства. Яе аўтары — вядомая пісьменніца Алена Стэльмах і пяць дзяўчынак рознага ўзросту, кожная з якіх прыдумала сваіх герояў і іх незвычайныя прыгоды. Згодна с сюжэтам кнігі, граф Эмерык пры вельмі загадкавых абставінах знаходзіць незвычайны куфэрак, з дапамогай якога ён можа падарожнічаць у часе. І вось граф, яго дачка Альжбэта, садоўнік Аловак, труска Розачка і шэраг іншых цікавых герояў адпраўляюцца на 500 гадоў назад — у друкарню Францыска Скарыны.

Неверагодныя прыгоды чакаюць не толькі герояў, але і чытачоў, якія павінны падчас чытання выконваць займальныя практычныя заданні. Кніга не толькі цікавая, але і карысная, бо пабудавана на рэальных фактах з гісторыі Беларусі, пераплеценых з легендамі і паданнямі сівой мінуўшчыны.

# Самалёты ляцяць да Францыска

Імем Францыска Скарыны ў краіне названы вуліцы, праспекты, бібліятэкі, школы, універсітэт у Гомелі. А генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў прапанаваў надаць імя першадрукара і Нацыянальнаму аэрапорту. Ідэю падтрымаў міністр культуры Барыс Святлоў, які паабяцаў, што пытанне мусіць быць вырашана да канца гэтага года.

## НАВІНКІ ВЫДАВЕЦТВАЎ

**“Сава Дым і яго жанчыны” (“Мастацкая літаратура”)**

У кнігу прозы Георгія Марчука ўвайшлі тры раманы, якія адлюстроўваюць жыццё беларусаў у горадзе, мястэчку і вёсцы. У першым рамане, па назве якога названы зборнік, галоўны герой, апынуўшыся ў горадзе, паддаўся спакусе жыць выключна для ўласнай асалоды. У другім — “Кветкі правінцыі” — малады чалавек, які пачынае самастойнае жыццё, мусіць даследаваць прычыны самагубства маці. А ў трэцім рамане — “Паляшук” — апавядаецца пра ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, які застаўся адзіны на ўсю вёску, куды прыязджаюць шукаць сэнс жыцця турысты — прадстаўнікі розных прафесій.

**“Маё невымаўля” (“Кнігазбор”)**

Зборнік вершаў маладой паэтэсы Насты Кудасавай прыйдзецца даспадобы нават тым, хто не надта любіць паэзію. Разгарнуць кнігу варта хаця б дзеля таго, каб пакаштаваць новых смакаў беларускай мовы. Наста — выдатны майстар паэтычных наватвораў кшталту “ніскімныя ночы”, “ехаць чалавекаспынам” або “невыгаўкны свет у вачах сабакі”. Ды і ў змесце можна знайсці шмат блізкага і шчырага. У кнізе “Маё невымаўля” схаваны перажыванні чалавека, закаханага ў жыццё і ў зямныя лёсы — лёс паэта, жанчыны, жука, сабакі, мядзведзя, сасны, ветру...

**“Нябесны фатограф” (“Чатыры чвэрці”)**

У паэтычнай кніжцы Міколы Маляўкі “Нябесны фатограф” сабраны шэраг вясёлых і сур’ёзных вершаў на самыя розныя тэмы — пра сяброўства, працу, каханне і прыгоды. Тут ёсць і любоў, і шчырая ўсмешка, і крыху сатыры. Рэальны свет сплятаецца з фальклорнымі вобразамі, а мірная цішыня разбаўляецца грымотамі жыццёвых навальніц.

**“Святло імёнаў дарагіх” (“Чатыры чвэрці”)**

Можна сказаць, што гэтая кніга прысвячаецца ўсім, каму надакучыла чытаць сухія біяграфіі беларускіх майстроў слова. Васіль Макарэвіч пастараўся не толькі ўзнавіць жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, але і заглыбіцца ў творы, пранікнуць у іх “лабараторыю”, зразумець, дзе тояцца і адкуль пачынаюць бруіць вытокі іх паэтычнага слова і таленту. Чытач пазнаёміцца з сакрэтамі біяграфіі і творчасці не толькі сталых аўтараў А.Куляшова, А.Вялюгіна, А.Русака, але маладзейшых С.Гаўрусёва,

А.Сербантовіча, А.Наўроцкага і нашых сучаснікаў І.Катлярова, Г.Пашкова, К.Камейшы.

**“Осторожно, злые гоблины!” (Издательский дом “Звязда”)**

Наталья Марчук знакомит с удивительными для белорусских сказок героями. На страницах книги читателя встретят не привычные леших, водяные и русалки, а гоблины, которые однажды решили доказать всем, что они ужасно злые. С этого момента и начинаются удивительные приключения принцессы Диодоры, единственной и неповторимой, и принца Фонифлена, которые совершенно не случайно попадают на борт проклятого корабля “Летучий ирландец”.

**“Интернет-сыщик” (“Беларусь”)**

Неудивительно, что в век компьютеров и новейших технологий появилась книга с таким названием. Кого сегодня заставишь сесть за приключения Ивана в дремучем лесу? А тут знакомые мониторы, браузеры, клавиатуры... Герои сказочных повестей Владимира Куличенко — смышленые школьники, отважные ученые и необычные роботы — напомнят, что наука — тоже волшебство, а интернет может творить настоящие чудеса.

Людмила Минкевич

Автор фото: БелТА

СБ – Беларусь сегодня